# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

## № 3 (13) 1997

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

***Галоўны рэдактар:***
**Л. Н. Ціханаў**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
А. А. Грымаць
Т. А. Грыгор'ева
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
Т. Е. Лемешава
(*адказны сакратар*)
М. І. Мішчанчук
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

### Педагогіка

*Вадзінскі Д. І.* Мова і педагагічная тэрміналогія даследавання ........ 3
*Елфімава С. М.* Педагагічная пераемнасць і праблема адаптацыі маладога настаўніка ........ 8
*Лазіцкая Ю. П.* Фарміраванне эстэтычных каштоўнасных арыентацый малодшых школьнікаў ... 13
*Гуляева Т. В.* Падрыхтоўка студэнтаў да пераадолення цяжкасцяў на этапе паслявузаўскай адаптацыі ........ 17
*Раманчык Н. В.* Сюжэтна-ролевае мадэляванне як метад асобасна-арыентаванага выхавання ........ 21
*Кобер Т. К.* Асаблівасці чытання малодшымі школьнікамі мастацкіх твораў ........ 24

### Псіхалогія

*Стаховіч Т. В.* Кібернетычнае мадэляванне творчага працэсу ........ 28

### Культуралогія

*Сухая В. А.* Кантамінацыя ў чарадзейнай казцы ........ 31

### Мовазнаўства

*Васілеўская А. С.* Праблема стылістычнай функцыі ў лінгвістычнай літаратуры ........ 38
*Наумович А. Н.* Роль интонации в предложениях с неоднородными определениями ........ 42
*Груца А. П.* Праславянскія *orz + *porx і іх адпаведнікі ў беларускай мове ........ 48

### Гісторыя

*Сурта А. М.* Арыянскія варварскія каралеўствы і каталіцкая царква ў Галіі ў V стагоддзі ........ 54

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

УДК 281

*А. М. Сурта*

# АРЫЯНСКІЯ ВАРВАРСКІЯ КАРАЛЕЎСТВЫ І КАТАЛІЦКАЯ ЦАРКВА Ў ГАЛІІ Ў V СТАГОДДЗІ

Шматлікія ўзрушэнні, якія ахапілі Заходнюю Рымскую імперыю ў апошняе стагоддзе яе існавання, аказалі непасрэдны ўплыў на становішча і ролю каталіцкай царквы. Як вядома, ужо ў першай палове V ст. усе пагранічныя вобласці Галіі былі заняты германскімі народамі, і толькі яе цэнтр быў пакуль свабодны ад іх паселішчаў. Наконт гэтага храніст Праспер Аквітанскі пісаў: “Няшчасны час, калі няма ні адной правінцыі без варварскіх пасяленцаў, і ненавісная ерась Арыя, якая ўсталявалася паміж варварскімі народамі, распаўсюджваецца ўсюды” [1].

Першапачатковы перыяд існавання варварскіх каралеўстваў, і ў першую чаргу вестгоцкага, у Галіі характарызаваўся мірным суіснаваннем германцаў-арыян з мясцовым насельніцтвам і каталіцкай царквой. Апошняя нават карысталася аўтарытэтам і павагай у кіруючай верхавіны вестготаў.

Дыскрымінацыя гальскай царквы і каталіцкага епіскапату з боку вестготаў пачалася тады, калі ў варвараў, якія адчулі смак уласнай улады, праявілася імкненне да незалежнасці ад імперыі. Адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты была ліквідацыя супраціўлення каталіцкай царквы. Менавіта такую палітыку праводзіў вестгоцкі кароль Эйрых (466-484). У рэлігійным пытанні ён, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў, быў фанатычным прыхільнікам арыянства. І першыя яго дзеянні паказалі нецярпімасць да каталіцкага веравызнання. Гала-рымскае насельніцтва Аквітаніі і Новемпапуланы пакутвалі ад ганенняў з боку вестготаў. Падобныя рэлігійныя схільнасці Эйрыха і ўціск каталіцкай царквы мелі сваёй галоўнай прычынай палітычны разлік [2]. Калі Тэадорых І і Тэадорых ІІ не імкнуліся да канчатковага разрыву з імперыяй (фармальна яны знаходзіліся пад яе апякунствам), то Эйрых паспрабаваў выкарыстаць яе прагрэсіруючы ўпадак для ўзмацнення самастойнасці вестгоцкага каралеўства і пашырэння яго тэрыторыі. А паколькі каталіцкая гальская царква была адным з вядучых інстытутаў імперыі, то неабходна было пахіснуць яе магутнасць і ўплыў. Клермонскі епіскап Сідоній Апалінарый апісваў сумны стан гальскіх цэркваў, якія знаходзіліся пад уладай вестготаў у час праўлення Эйрыха: “Ніхто не клапоціцца аб епархіях і прыходах, якія абязлюдзелі. У цэрквах можна ўбачыць абломкі паваліўшыхся дахаў, дзверы базілік, якія сарваны са створак, і ўваход загароджваюць галіны

дзікага цярноўніка. Можна бачыць нават — на жаль — жывёлу, якая ляжыць у прыадкрытых прытворах і нават якая пасвіцца на траве каля алтароў. Запусценне не толькі ў вясковых прыходах, радзеюць і зборышчы ў гарадскіх цэрквах.” [3]. І гэта нядзіўна: у выніку забароны Эйрыхам займаць вакантныя кафедры каталіцкіх эпіскапаў многія гарады вестгоцкага каралеўства ў Галіі і іх наваколлі былі пазбаўлены “вышэйшага свяшчэнства” [4], таму што пасля смерці адных епіскапаў другія не маглі заняць іх пасады.

Аднак, паводле звестак Сідонія, няма падставы лічыць, што размова ішла аб пакараннях смерцю духавенства, аналагічна як у клермонскага епіскапа адсутнічаюць упамінанні або намёкі пра гэта. Хаця ў больш позніх крыніцах, напрыклад, у Грыгорыя Турскага (каля 540 — каля 594), які, напэўна, згусціў фарбы, размова ідзе аб пакараннях смерцю і прымусовым закрыцці цэркваў [5]. У дадзеным выпадку большы давер выклікаюць факты, якія прыводзіў Сідоній, а не турскі епіскап. Апошні не з’яўляўся сучаснікам падзей, а толькі іх позним інтэрпрэтатарам. Тым не менш Эйрых выкарыстоўваў пэўныя прымусовыя сродкі адносна гальскіх епіскапаў, каб ліквідаваць іх супраціўленне. Галоўным мерапрыемствам у гэтым сэнсе была высылка епіскапаў, якія аказвалі яму актыўнае непадпарадкаванне, і забарона на замяшчэнне іх кафедраў. Такі лёс напаткаў і самога Сідонія Апалінарыя, які быў сасланы ў крэпасць Лівію каля Каркасона (сёння гэта тэрыторыя Францыі), таму што ён прымаў удзел у арганізацыі барацьбы горада Клермона супраць вестготаў за сваю прыналежнасць да Рымскай Імперыі [6]. У справе, за якую змагаўся Клермон, было зацікаўлена каталіцкае насельніцтва Галіі. Яе правадырамі былі епіскапы, якія спадзяваліся на тое, што вобласці Аквітаніі, яшчэ раней захопленыя вестготамі, будуць падпарадкоўвацца Эйрыху толькі ва ўмовах забеспячэння інтарэсаў гала-рымскага насельніцтва [7].

Да ліку мер вестгоцкага караля, якія былі накіраваны супраць каталіцкай царквы, адносіцца таксама забарона кантактаў і зносін паміж гальскімі епіскапамі [8]. Так, у пісьме да Фауста Рыецкага Сідоній Апалінарый скардзіўся на падазронасць гоцкага ўрада, які ўскладняў нават перапіску паміж каталіцкімі епіскапамі. Хаця раней, нягледзячы на палітычны падзел Галіі, духавенства з’язджалася на свае саборы нават у часы ваенных дзеянняў.

Арыянскае духавенства, падбадзёранае рашучасцю Эйрыха, арганізоўвала розныя інтрыгі пры выбранні вышэйшага каталіцкага кліра [9]. А вестгоцкі епіскап Мадахарый спрабаваў нават распаўсюджваць арыянства ў Правансе, але атрымаў адпор з боку епіскапа горада Экса Васіля [10]. Увогуле, практычна любыя місіянерскія спробы арыянскага духавенства ў асяроддзі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

гала-рымскага насельніцтва былі асуджаны на правал. Паражэнне арыянскай царквы было абумоўлена яе ўнутранымі асаблівасцямі: залежнасцю і падпарадкаваным становішчам арыянскага духавенства адносна свецкай улады, без падтрымкі якой яно не магло існаваць. Акрамя таго, яно было менш адукаваным, чым каталіцкія гальскія епіскапы, якія атрымалі рымскую адукацыю і абапіраліся на спрадвечныя паданні і традыцыі царквы. Арыянская ж царква ўзнікла ў варвараў у дадзяржаўны перыяд іх існавання і была прыстасавана менавіта да гэтай сістэмы. У час з'яўлення варварскіх каралеўстваў на тэрыторыі Галіі арганізацыйная структура арыянскай царквы па-ранейшаму заставалася прымітыўнай, заснаванай на старагерманскіх традыцыях. Па гэтай прычыне канкурэнцыя арыянскага духавенства з больш магутнай, арганізаванай і адаптаванай да мясцовых умоў каталіцкай царквой была не на карысць першай, тым больш, што арыянства, нават у час свайго росквіту ў IV ст., ніколі не мела трывалых каранёў у Галіі.

Крыніцы не даюць ніякай інфармацыі аб якой-небудзь дыскрымінацыі каталіцкага духавенства, пасля таго як пагроза Эйрыха ўварвацца ў квітнеючыя прыморскія вобласці Галіі прымусіла епіскапскую дыпламатычную місію купіць мір у 474 г. цаной уступкі вестготам Клермона [11].

28 жніўня 475 г. імператар Непат пакінуў Італію, а праз год апошні рымскі імператар Ромул Аўгустул быў звергнуты з прастола, і паўднёвыя вобласці Галіі, для ратавання якіх Непат ахвяраваў Клермон, былі захоплены вестготамі без усякага супраціўлення. Яны ў гэты час набылі вядучае становішча сярод усіх германскіх народаў, усталяваўшыхся ў Галіі, а кароль Эйрых лідзіраваў сярод іншых германскіх правадыроў.

Епіскапы Галіі і каталіцкая царква ў V ст. павінны былі будаваць свае адносіны не толькі з вестготамі, але і з іншымі германскімі народамі, якія стварылі ў Галіі свае дзяржавы, у прыватнасці, з бургундамі. Яны ўжо ў 413 г. былі прызнаны федэратамі Заходняй Рымскай імперыі і атрымалі сваё месца для пасялення ў раёне горада Вормса. Бургунды ў той жа час прынялі хрысціянства ў яго арыянскай форме. Ва ўсякім выпадку, у сярэдзіне V ст. у заснаваным імі ў 457 г. Бургундскім каралеўстве яны выступаюць як хрысціяне-арыяне [12]. Таксама, як і пасяленні вестготаў у Галіі, паселішчы бургундаў былі невялікім анклавам сярод мясцовага насельніцтва [13]. У другой палове гэтага стагоддзя працэс фарміравання Бургундскага каралеўства завяршыўся, яго сталіцай стаў Ліён [14].

Царкоўна-мітрапалітальнае дзяленне Галіі ў час варварскіх заваяванняў не змянілася, яно па-ранейшаму грунтавалася на прынцыпе старой адміністратыўнай структуры імперыі. Падобны парадак не парушалі і правыдары германскіх каралеўстваў. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адносінах да гальскай царквы бургундскія каралі праводзілі палітыку не тольлкі рэлігійнай талерантнасці, але і праяўлялі да яе відавочную схільнасць. Яны давалі ёй фактычна такую ж свабоду, якой яна карысталася ў час імператарскай улады. Аб верацярпімасці бургундаў пісалі некаторыя хрысціянскія аўтары [15]. Практычна заўсёды дзейнасць бургундскіх каралёў адносна гальскай царквы была накіравана на абарону ўсталяванага царкоўнага парадку і выкананне кананічных прадпісанняў. Так, папа Гіларый спрыяў да бургундскага караля Гундыёха, нягледзячы на тое, што той быў арыянінам [16]. Падобныя адносіны з боку кіраўніка рымскай кафедры бургундскі кароль заслужыў тым, што аказаў належную павагу статусу Гіларыя. Ён звярнуўся да папы як да вышэйшага суддзі ў справах гальскай царквы. У 464 г. Бургундскі кароль звярнуўся да рымскага епіскапа са скаргай на мітрапаліта в'енскага Мамерта за неправамоцнае пасвячэнне епіскапа ў горадзе Дзі [17]. Галія, падзеленая паміж варварскімі каралеўствамі, захавала сваю царкоўную арганізацыю, і, больш таго, самі германскія каралі падтрымлівалі існаваўшы парадак. Брат Гундыёха Хільперых I спрыяў манастыру ў Юры, аказваў яму штогод матэрыяльную дапамогу [18]. А вядомы бургундскі кароль Гундабад (480-516) за час свайго працяглага кіравання праяўляў такую бесстароннасць адносна каталіцкай рэлігіі і гальскага епіскапата, што адсутнасць арыянскага празэлітызму ў бургундскім каралеўстве і цярпімасць да веравызнання былі азначаны на Ліёнскім саборы ў 499 г. [19]. Пляменніца Гундабада, якая стала жонкай франкскага караля Хлодвіга, ужо належала да каталіцкай веры [20].

Сацыяльна-палітычны вопыт каталіцкага гальскага духавенства выкарыстоўваўся некаторымі варварскімі каралямі. Так, бургундскія каралі запрашалі адукаваных гальскіх епіскапаў для дапамогі ў кіраванні дзяржавай. Напрыклад, ліёнскі епіскап Еўхерый быў саветнікам пры каралеўскім двары [21]. Зацікаўленасць у саюзе была ўзаемнай. З аднаго боку, варвары імкнуліся да саюза з каталіцкай царквой, якая валодала большым уплывам на мясцовае насельніцтва і мела эканамічныя рэсурсы. З другога — само гала-рымскае грамадства было зацікаўлена у тым, каб каталіцкае духавенства набыло ўплыў на варвараў, абуджала ў іх ідэі парадку і гуманізму, зрабіла іх прадаўжальнікамі рымскай цывілізацыі.

Такім чынам, рэлігійная палітыка большасці германскіх каралёў-арыян характарызавалася лаяльнасцю адносна каталіцкага насельніцтва Галіі і павагай да яе царквы. Такая пазіцыя была абумоўлена, відавочна, статусам варвараў адносна імперыі, якія з яе добраахвотнай згоды ўмацаваліся на гальскіх землях як саюзнікі і як падданыя. А ганенні прывялі б да разрыву гэтых адносін. Між тым многія германцы адчувалі пачуццё трапят-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лівай павагі ў адносінах да былой велічы імперыі, адным з элементаў якой была хрысціянская царква. Другая прычына рэлігійнай талерантнасці германскіх правадыроў заключалася, магчыма, у маталікасці варвараў адносна гала-рымскага насельніцтва. У-трэціх, сама арыянская царква германцаў была вельмі прымітыўнай і слабаарганізаванай, акрамя таго, яна занадта залежала ад сваіх каралёў, каб адказваць на іх уціск у пытанні правядзення рэлігійнай палітыкі. Арыянства варвараў было часовай і цалкам пераадольнай перашкодай на шляху асіміляцыі і інтэграцыі германцаў і гала-рымскага насельніцтва. Як адзначаў А. Р. Корсунскі [22], па меры збліжэння мясцовай і германскай служылай знаці знікала падстава для існавання ў варварскіх каралеўствах дзвюх хрысціянскіх цэркваў. І ў пачатку VI ст. каталіцызм усталяваўся ў асяроддзі бургундаў, а ў 507 г. у вестготаў, пасля заваявання іх франкамі [23].

### ЛІТАРАТУРА


1. *Prosp. Aquit.* Chronic., XLV, 14.
2. *Sidon. Apoll.* Epist., VII, 6.
3. Ibidem.
4. Ibidem.
5. *Gregor. Turon.* Hist. Franc., II, 25.
6. *Sidon. Apoll.* Epist., VIII, 3; VII, 6, 7.
7. Ibidem, VII, 9.
8. Ibidem, VII, 5, VII, 8.
9. Ibidem, VII, 9.
10. Ibidem, VII, 6.
11. Ibidem, II, 6.
12. *Oros.* Hist. adv. pagan., VII, 30; *Demougeot E.* La formation de I Europe et les invasions barbares de l`avenemeot de Diocletien au debut du VI siecle. Vol II Paris, 1979. P.492; *Gunter R., Kopstein H.* Die Romer an Rhein und Donau. Berlin, 1975. S.374.
13. *Bauffard P.* Necropoles burgondes de la Suisse. Les garnittures de centure Geneve-Nyon, 1945. P.9-13, 79-86; *Moosbrugger-Leu R.* Die Schweiz zur Merovingerzeit. B. II. Bern, 1971. S.15.
14. *Loening E.* Geschichte des deutschen Kirchenrechts. Bd. II. Strassburg, 1878. S.550. *Musset L.* Les inwasions. Les pagues germaniques. Paris, 1969. P.285.
15. *Oros.* Hist. adv. pagan., VII, 41.
16. *Hilar. papa.* Epist., IX.
17. Ibidem.
18. *Gregor, Turon.* Vita Partum, I, 5.
19. *Demougeot E.* Op. cit. P.661; *Perrin O.* Les Burgundes.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Neuchatel, 1968. P.448.
20. *Gregor. Turon.* Hist. Franc., II, 29-30.
21. *Fauriel C.* Histore La Gaule meridionale les conque rants germeins. Vol. I. Paris, 1836. P.570.
22. *Корсунский А.Р.* Образование раннефеодального государства в Западной Европе. М., 1963. С.170.
23. *Chadwick H.* Die Kirche in der antiken Welt. Berlin; New-York, 1972. S.249.

*SUMMARY*

***The religious policy of the most German arian-Kings was characterized by loyalty towards the catholis population of Gallea and respect for its church.***

УДК 329.14 (476) (091)

*Н. А. Глушакова*

# ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў СТРАТЭГІІ І ТАКТЫЦЫ ПАРТЫІ БЕЛАРУСКІХ ЭСЭРАЎ (1918-1924 ГГ.)

Падзеі канца 1917 — пачатку 1918 гадоў на Беларусі і вакол яе (перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі; разгон І Усебеларускага з'езда; савецка-германскія перагаворы і затым падпісанне Брэсцкага міру пры поўным ігнараванні беларускай праблемы; абвяшчэнне незалежнасці Украінскай Народнай Рэспублікі, а асабліва — Літоўскай, што азначала неажыццявімасць канцэпцыі віленскіх дзеячаў аб стварэнні супольнай беларуска-літоўскай дзяржавы; узросшыя прэтэнзіі на беларускія землі з боку палякаў) умацавалі ў беларускім нацыянальным руху імкненне да палітычнай незалежнасці. Ці здольныя беларусы стварыць незалежную дзяржаву і кіраваць ёю? Што пакласці ў аснову дзяржаўнага будаўніцтва? З чаго пачаць аднаўленне нацыянальнай дзяржаўнасці ў даволі неспрыяльных умовах таго часу? На гэтыя і іншыя пытанні спрабавалі даць адказ многія беларускія партыі і арганізацыі, розныя па сваёй сацыяльна-класавай сутнасці і палітычнай арыентацыі.

Сваю канцэпцыю нацыянальнага адраджэння Беларусі распрацавала і партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У яе аснову была пакладзена ідэя ўласна-беларускага дзяржаўнага жыцця, з якой белэсэры звязвалі перспектывы палітычнага, эканамічнага і духоўнага росквіту народа. У сваім першым праграмным дакуменце брашуры "Чаго дамагаецца Беларуская партыя